# ЗАГАДКІ БРЭСТЧЫНЫ: ЛІНГВАКРАЯЗНАЎЧЫ ЗМЕСТ

*Анішчук Аляксандр Васільевіч*

УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

Загадка – іншасказальны твор малой формы (парэмія), у аснове якога ляжыць мастацкае параўнанне разнастайных з'яў і прадметаў рэчаіснасці. Загадкі могуць быць як літаратурныя, так і фальклорныя. Для лінгвакраязнаўчага аналізу намі ўзята загадка як малы жанр фальклору Брэстчыны.

Сярод лінгвакраязнаўча вартасных загадак Брэстчыны намі адабраны тыя, у складзе якіх ёсць безэквівалентная лексіка і онімы.

Некаторыя лінгвісты адносяць онімы да безэквівалентнай лексікі, бо ў іх захоўваюцца адметнасці культуры, гісторыі, геаграфіі і ландшафту рэгіёна. У загадках адлюстравана нацыянальна-рэгіянальная спецыфіка, антрапонімы нясуць адбітак нацыянальнасці і лакальнасці, сацыяльнасці і гістарычнасці, псіхалагічнасці і інтэлектуальнасці. Разам з тым, у сваіх дэмінутывах і квалітатывах анамастыкон загадак адлюстроўвае і супадае з існуючым у мове антрапанімІконам. Што да напісання асабовых імёнаў, то амаль усе яны фіксуюцца ў беларускіх размоўна-бытавых формах і варыянтах: *Панкрат, Ігнат, Мартын, Пытрок, Андрыйцё* і інш.

Найперш вылучаецца група загадак, у якіх мастацкі вобраз будуецца на ўласных імёнах. У славістыцы такія загадкі называюць індэксальнымі. А.І. Гурскі вызначае асноўную функцыю імені ў такіх загадках як рытма- і рыфмаўтваральную: *Мый брат Панкрат чырыз стыну пройшов і грошы знайшов* (свярдзёлак); *Ігнат-хват пуд зэмню пошов, красну шапочку знайшов, проты соньца став, шапку зьняв* (мак).

Імя выкарыстоўваецца і для стварэння метанімічнага мастацкага вобраза: *Жылізный выз вызэ, косьцяшкы – тое, шо прывызуть, сычуть, мокрый Мартын – закыдуе* (лыжка, зубы, язык); *У нашыйі Марыйі собакы злыйі, ны хліба, ны мняса ны йідять* (пчолы); *Кыну крывýлыцю чырыз плыт на гулыцю, сокіркы сычуть, а Андрыйцё поворочуе* (лыжка, зубы, язык).

Своеасаблівую вобразнасць набывае агіёнім, бо тут, акрамя параўнання, прысутнічае і "ўяўнае" супрацьпастаўленне, і сувязь з пэўным часавым перыядам: дзень Пятра і Паўла святкуецца 12 ліпеня. Згодна з народнай прыметай сонца пастунова паварочнае да зімы, а лета – да гарачыні. *Прыйшов Пытрок, тыпло зволок, сам ны бігае, а стояшчых ны любыть* (мароз).

У некаторых загадках ўжываюцца лексемы, утвораныя адрознымі ад літаратурных адзінак словаўтваральнымі сродкамі: *товстуха, рыжуха,*

*выжша, ныжша* і інш. У большасці загадак з такімі словамі выканрыстоўваюцца антрапаморфныя вобразы: *Маты товстуха, дочка рыжуха, сын – пырыбы́р выскочыв на двыр* (печ, агонь, дым); *Встану – выжша за коня, ляжу – ныжша за кота* (дуга).

Рэдка ў загадках ўжываюцца ўстарэлыя словы, якія звычайна паказваюць на адметнасць рэгіёну ў побытавым плане. Гэта значыць, што некаторыя прадметы і з’явы рэчаіснасці характарызуюць бытавыя, сацыяльныя, культурныя, экалагічныя і іншыя ўмовы жыцця жыхароў пэўнага рэгіёна.  Загадванне будуецца на аснове супастаўлення: *Всі паны скынулы жупаны, а тры пана ны скыдають жупана* (хвоя, елка, піхта).

Да безэквівалентнай лексікі адносяцца і семантычныя дыялектызмы, напрыклад, *талый, тнуцьця* і інш.:  *За білым бырызняком та́лый брэшэ* (язык); *Всі кажуть, шчо воны йдуть, а воны з місьця ны тну́цьця* (гадзіннік). Слова *тнуцьця* мае значэнне ‘не зрушыцца, не скрануцца з месца’.

Мова як любога фальклорнага твора ў цэлым, так і загадкі ў прыватнасці служыць асноўным матэрыялам, з дапамогай якога будуецца мастацкі вобраз і выказваецца мастацкая ідэя. Выразныя магчымасці слова, у тым ліку і безэквівалентнага, выяўляюцца ў прамой залежнасці ад задач вобразнага адлюстравання жыцця.